Голас Радзімы

№ 44 (1822)
3 лістапада 1983 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

СССР НЕ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД ПОШУКАЎ ДАГАВОРАНАСЦІ

[«Адказы Ю. У. Андропава на пытанні газеты «Правда»] стар. 2

КОЛЬКІ БУДЗЕМ ЖЫЦЬ, НЕ ЗАБУДЗЕМ БЕЛАРУСЬ

[«Уручаецца пасведчанне...»] стар. 4

МОВАЙ І СРОДКАМІ ТЭЛЕЭКРАНА

[«Клопаты і праблемы рэжысёра Забелы»] стар. 6

Роўна трыццаць гадоў назад — у кастрычніку 1953-га — з канвеера Мінскага трактарнага завода сышоў першы трактар «Беларусь». Сёння гэта марка набыла сусветную вядомасць. Прадукцыя завода паступае больш чым у 70 краін.

НА ЗДЫМКУ: да адпраўкі гатова чарговая партыя трактароў «Беларусь» [артыкул «Чацвёртая маладосць гіганта» пра Мінскі трактарны завод чытайце на 3-й стар.].

Фота Г. УСЛАМАВА.

АДКАЗЫ Ю. У. АНДРОПАВА

НА ПЫТАННІ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА»

Пытанне. Якое становішча спраў на савецка-амерыканскіх перагаворах аб абмежаванні ядзерных узбраенняў у Еўропе, што адбываюцца ў Жэневе? Ці ёсць там хоць бы нейкі рух наперад?

Адказ. Ніякага руху ў напрамку дагаворанасці на перагаворах, на жаль, няма. Там паранейшаму тупіковая сітуацыя. Чаму гэта так, цяпер ужо ясна, думаецца, нават самым прававерным саюзнікам ЗША, і толькі блокавая лаяльнасць перашкаджае ім прызнаць гэта адкрыта.

За два гады перагавораў Савецкі Саюз пераканаўча даказаў, што ён гатоў ісці на смелыя рашэнні дзеля таго, каб адвесці ядзерную небяспеку ад Еўропы, умацаваць бяспеку на нашым кантыненце і ва ўсім свеце. Унесеныя намі прапановы прадугледжваюць шырокі дыяпазон магчымых мер: ад істотных скарачэнняў ядзерных сродкаў сярэдняй дальнасці да поўнай ліквідацыі ў Еўропе ядзернай зброі як тактычнай, так і сярэдняй дальнасці. Яны змяшчаюць усе неабходныя элементы для ўзаемапрымальнай дагаворанасці, якая не ўшчамляе нічыіх інтарэсаў — ні СССР і яго саюзнікаў, ні ЗША, ні заходнееўрапейскіх дзяржаў.

У Вашынгтоне за апошні час робяцца шматлікія заявы аб тым, што ЗША таксама за дагаворанасць і што яны сталі праяўляць большую гібкасць на перагаворах. Мы старанна аналізавалі ўсе гэтыя заявы і тое, што гаворыцца амерыканскай дэлегацыяй у Жэневе. На паверку аказваецца, што далей слоў амерыканская гібкасць не ідзе. Сутнасць жа лініі ЗША застаецца нязменнай: забяспечыць сабе значную ваенную перавагу перад СССР шляхам разгортвання новых амерыканскіх ракет у Еўропе.

Да таго часу, пакуль ЗША будуць прытрымлівацца сваёй нерэалістычнай, аднабокай пазіцыі, у адпаведнасці з якой СССР павінен быў бы скарачаць свае ядзерныя ўзбраенні сярэдняй дальнасці, а ЗША і іх саюзнікі па Паўночнаатлантычнаму дагавору — нарошчваць, разлічваць на прагрэс у перагаворах, вядома, нельга.

Пытанне. Ці вычарпаны ўсе магчымасці для дасягнення дагаворанасці?

Адказ. Залежыць гэта перш за ўсё ад ЗША, ад таго, ці гатовы яны перайсці да дзелавой размовы. Савецкі Саюз не адмаўляецца ад пошукаў дагаворанасці да таго часу, пакуль Злучаныя Штаты сваімі дзеяннямі не зробяць яе немагчымай.

Мы праяўлялі і праяўляем гібкасць у пошуку канкрэтных рашэнняў пры захаванні аднаго, але абавязковага патрабавання: раўнавага сіл у Еўропе па ядзерных узбраеннях сярэдняй дальнасці не павінна быць парушана. Узровень гэтых узбраенняў у абодвух бакоў можа і павінен быць радыкальна зніжаны, але такім чынам, каб суадносіны сіл паміж імі засталіся нязменнымі.

Гэта азначае, па-першае, што ў Еўропе не павінны размяшчацца новыя амерыканскія ракеты, паколькі гэта рэзка змяніла б для выгады НАТО ўсю ваенна-стратэгічную сітуацыю. Па-другое, на тым і другім баку павінны ўлічвацца ўсе ядзерныя сродкі адпаведнай дальнасці, без усякіх выключэнняў.

Ад гэтага справядлівага патрабавання мы не адступім. Але ў рамках такога прынцыповага падыходу мы, паўтараю, праяўляем гібкасць і канструктыўнасць. Аб некаторых нашых дадатковых кроках у гэтым плане магу сказаць і сёння.

Першае. Савецкі Саюз выказаў, як вядома, гатоўнасць дагаварыцца аб скарачэнні ядзерных узбраенняў сярэдняй дальнасці ў Еўропе да аднолькавых у абодвух бакоў узроўняў як па носьбітах (ракетах і самалётах), так і па боезарадах на іх. Сёй-той пытае: а як зробіць Савецкі Саюз, калі для таго, каб забяспечыць роўнасць па боегалоўках на ракетах з аднаго боку СССР, а з другога — Англіі і Францыі, яму прыйшлося б мець меншую колькасць пускавых установак ракет, чым іх ужо ёсць на баку НАТО?

Што ж, мы гатовы пайсці і на гэта. Нас не бянтэжыць тое, што пры такім падыходзе, і маючы на ўвазе колькасць боегаловак на англійскіх і французскіх ракетах у сучасны момант, СССР мог бы мець у Еўропе прыкладна 140 пускавых установак ракет СС-20, гэта значыць прыкметна менш, чым ёсць пускавых установак ракет сярэдняй дальнасці ў Англіі і Францыі.

Другое. Не так даўно намі было заяўлена, што пры дасягненні ўзаемапрымальнага пагаднення, уключаючы адмову ЗША ад размяшчэння ракет у Еўропе, Савецкі Саюз ліквідаваў бы ўсе свае скарачаемыя ў еўрапейскай зоне ракеты замест перабазіравання іх на ўсход. І зноў-такі сёй-той пытае: а ці не атрымаецца так, што паралельна з ліквідацыяй ракет у еўрапейскай частцы Савецкага Саюза ў яго ўсходніх раёнах будзе нарошчвацца колькасць такіх жа ракет, якія затым маглі б быць перакінуты з усходу на захад?

Ніякіх падстаў для такіх апасенняў няма. Але для таго, каб наогул выключыць усякія сумненні наконт гэтага, магу адназначна сказаць: перакідкі савецкіх ракет з усходу на захад не будзе; у выпадку дасягнення пагаднення аб абмежаванні ядзерных узбраенняў у Еўропе і яго ўступлення ў сілу з гэтага моманту будзе таксама спынена разгортванне ракет СС-20 ва ўсходніх раёнах СССР. І мы будзем цвёрда зыходзіць з гэтага пры ўмове, што ў азіяцкім рэгіёне не мелі б месца істотныя змяненні стратэгічнай сітуацыі. Гэта азначае, перш за ўсё, што ЗША не будуць разгортваць новых ядзерных сродкаў сярэдняй дальнасці ў раёнах, адкуль яны маглі б дасягнуць усходняй часткі тэрыторыі СССР.

Трэцяе. Іншы раз гавораць, што наша прапанова аб тым, каб у кожнага боку пасля скарачэнняў засталося не больш чым 300 носьбітаў ядзернай зброі сярэдняй дальнасці, ужо вельмі, маўляў, падразае амерыканскія авіяцыйныя сродкі адпаведнага радыуса дзеяння.

У нас няма мэты ўшчамляць ЗША. Хоць дзеля справядлівасці варта напомніць, што савецкія самалёты сярэдняга радыуса дзеяння не базіруюцца ў іншых краінах, адкуль бы яны маглі дасягаць тэрыторыі ЗША.

Але і тут мы гатовы праявіць дадатковую гібкасць: устанавіць роўныя для СССР і НАТО сумарныя ўзроўні самалётаў-носьбітаў сярэдняга радыуса дзеяння ва ўзаемапрымальным колькасным дыяпазоне, хоць бы ён і істотна адрозніваўся ад таго, што раней прапаноўваўся намі. Канкрэтныя значэнні гэтых узроўняў маглі б быць узгоднены, а таксама ўдакладнены састаў абмяжоўваемых самалётаў-носьбітаў.

Выхад з тупіка, у якім аказаліся жэнеўскія перагаворы, ёсць. Яго трэба толькі выкарыстаць. Калі б ЗША праявілі сапраўднае жаданне пайсці на ўзаемапрымальную дагаворанасць, для выпрацоўкі пагаднення не запатрабавалася б многа часу.

Пытанне. Сёй-той на Захадзе выказваецца ў тым сэнсе, што Савецкі Саюз мог бы, маўляў, у парадку праяўлення добрай волі ўжо цяпер пайсці на аднабаковае скарачэнне сваіх ракет у Еўропе. Што Вы скажаце наконт гэтага?

Адказ. Так, нам вядомы такія заклікі. Яны іншы раз зыходзяць і ад людзей, якія сапраўды клапоцяцца аб захаванні міру ў Еўропе.

Нам добрай волі не пазычаць. З нашага боку не было недахопу ў кроках, у тым ліку аднабаковых, у мэтах стварэння максімальна спрыяльнай абстаноўкі для дасягнення поспеху на перагаворах.

Напомню, што СССР паўтара года назад увёў мараторый на разгортванне ядзерных узбраенняў сярэдняй дальнасці ў сваёй еўрапейскай частцы. І насуперак усякім паклёпам гэты мараторый няўхільна захоўваецца. Было спынена дадатковае размяшчэнне ракет і за Уралам — у тых раёнах, адкуль яны маглі б дасягаць краін Заходняй Еўропы.

Больш таго, за той перыяд, калі вядуцца перагаворы, Савецкі Саюз зняў з узбраення не адзін дзесятак сваіх ракет сярэдняй дальнасці ў Еўропе. К сённяшняму дню поўнасцю выведзены з баявога саставу ракеты СС-5, якія былі раней разгорнуты ў еўрапейскай зоне і якія, дарэчы, мелі не меншую дальнасць, чым СС-20, а па магутнасці боезарада намнога перавышалі іх.

Тыя, хто звяртаецца з заклікамі да СССР скараціць у аднабаковым парадку колькасць яго ракет сярэдняй дальнасці, магчыма, знаходзяцца ў няведанні аб тым, што фактычна мы ўжо робім гэта. Але аб сапраўдным становішчы спраў добра праінфармаваны, вядома, і ўрад ЗША, і ўрады іншых краін НАТО. Яны, аднак, скрываюць праўду ад сваіх народаў, ашукваюць іх.

Тым часам Вашынгтон упарта вядзе справу да таго, каб у бліжэйшы час пачаць разгортванне ў Заходняй Еўропе сваіх «першынгаў» і крылатых ракет. Нішто не гаворыць аб тым, што ЗША былі б гатовы адмовіцца ад такога разгортвання, калі б Савецкі Саюз працягваў і далей скарачаць у аднабаковым парадку свае ракеты. Наадварот, усё гаворыць аб іншым. Таму рызыкаваць сваёй бяспекай і бяспекай сваіх саюзнікаў Савецкі Саюз, зразумела, не можа і не будзе.

Іншая справа, калі б ЗША адмовіліся ад размяшчэння сваіх ракет у Еўропе ў аб'яўленыя тэрміны і тым самым далі б магчымасць прадоўжыць перагаворы і пошукі ўзаемапрымальных рашэнняў. Тады б мы маглі пачаць ужо цяпер скарачэнне сваіх ракет СС-4 (а іх у нас звыш 200) і завяршыць іх ліквідацыю на працягу 1984—1985 гадоў. А калі б удалося заключыць пагадненне ў Жэневе на справядлівай аснове, аб якой мы неаднаразова гаварылі, то была б, зразумела, ліквідавана і значная частка наяўных цяпер ракет СС-20.

Пытанне. У заходніх сталіцах робяцца заявы, быццам з пачаткам разгортвання амерыканскіх ракет перагаворы атрымаюць новы імпульс і будуць больш прадуктыўнымі. Як расцаніць такія заявы?

Адказ. Гэта чыстай вады ашуканства, якое мае на мэце збіць напал барацьбы заходнееўрапейскіх народаў супраць паяўлення ў Еўропе амерыканскіх ядзерных ракет.

Тут павінна быць поўная яснасць: паяўленне ў Заходняй Еўропе новых амерыканскіх ракет зробіць немагчымым працяг перагавораў, якія вядуцца цяпер у Жэневе. З другога боку, жэнеўскія перагаворы могуць быць прадоўжаны, калі ЗША не пачнуць фактычнага размяшчэння ракет.

падзеі • людзі • факты

СУСТРЭЧА Ў ЦК КПБ

Залатым фондам партыі называюць савецкія людзі яе ветэранаў. Іх лёс — жывая тканіна гісторыі. Іх велізарны жыццёвы вопыт — бясцэнны здабытак народа. Іх вернасць справе Леніна, адданасць Радзіме, высокая грамадзянская актыўнасць — прыклад для пераймання. Перадаючы новым пакаленням свае веды, сваю энергію і перакананасць, яны па-ранейшаму ў першых шарэнгах стваральнікаў новага жыцця.

У Цэнтральным Камітэце Кампартыі Беларусі нядаўна адбылася сустрэча з ветэранамі партыі. На ёй выступілі: член КПСС з сакавіка 1917 года, удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны У. Вавераў, актыўны ўдзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі, сацыялістычнага будаўніцтва ў рэспубліцы, заслужаны аграном БССР А. Дрозд, акадэмік Акадэміі навук БССР, былы прэзідэнт АН БССР К. Гораў і іншыя ветэраны.

З вялікай прамовай да прысутных звярнуўся першы сакратар ЦК КП Беларусі М. Слюнькоў. Ён запэўніў, што ўсе прапановы і пажаданні, выказаныя на сустрэчы, будуць старанна разгледжаны і ўлічаны ў практычнай рабоце партыйнай арганізацыі рэспублікі.

Далей прамоўца падрабязна спыніўся на пытаннях эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі, адзначыў той узрастаючы ўклад, які ўносіць наша рэспубліка ў прымнажэнне матэрыяльных і духоўных багаццяў краіны.

Усё, над чым мы працуем у вытворчай сферы, падкрэсліў М. Слюнькоў, мае ярка выражаную сацыяльную накіраванасць. Клопат аб чалавеку, аб больш поўным задавальненні яго растучых матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей — галоўны клопат нашай партыі, вышэйшая мэта яе эканамічнай і сацыяльнай палітыкі.

У рэспубліцы, як і ва ўсёй краіне, паспяхова ажыццяўляецца праграма павышэння дабрабыту людзей. Сярэднямесячная зарплата рабочых і служачых у першай палавіне адзінаццатай пяцігодкі павялічылася на 7 працэнтаў, аплата працы калгаснікаў — на 16.

Затым прамоўца спыніўся на тых задачах, якія сёння стаяць перад савецкім народам. М. Слюнькоў падкрэсліў, што ў іх вырашэнні партыя разлічвае на актыўны ўдзел нашых ветэранаў.



НА ЗДЫМКУ: сустрэча з ветэранамі партыі ў ЦК КПБ.

НА СЕСІІ ААН

ВЫСТУПЛЕННЕ ПРАДСТАЎНІКА БЕЛАРУСКАЙ ССР

У першым камітэце XXXVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытаннях абмежавання і спынення гонкі ўзбраенняў выступіў прадстаўнік БССР С. Броннікаў. На словах прадстаўнікі краін НАТО, адзначыў ён, дэкларуюць сваю прыхільнасць да справы міру. Аднак падзеі апошняга часу даюць новыя пацвярджэнні таго, як іх словы разыходзяцца са справамі.

Прамоўца падверг крытыцы «аргументы» праціўнікаў ідэі замарожвання ядзерных узбраенняў з ліку прадстаўнікоў краін — членаў НАТО. Прывёў шматлікія даныя, якія сведчаць аб тым, што спасылкі на «савецкую перавагу», «пасіўнасць» ЗША ў нарошчванні ядзерных узбраенняў, «савецкую ваенную пагрозу» — толькі цынічная спроба апраўдаць нястрымнае нарошчванне ракетна-ядзернага патэнцыялу ЗША, каб дагадзіць ваенна-прамысловаму комплексу.

С. Броннікаў выступіў за заключэнне дагавора аб поўнай і ўсеабдымнай забароне выпрабаванняў ядзернай зброі, за неадкладную распрацоўку канвенцыі аб забароне вытворчасці, накаплення, разгортвання і прымянення ядзернай нейтроннай зброі, за распрацоўку праграмы паэтапнага ядзернага раззбраення.

ЧАЦВЁРТАЯ МАЛАДОСЦЬ ГІГАНТА

— Вы спрабавалі калі-небудзь пераабуцца на ходу, — задае нечаканае пытанне галоўны інжынер вытворчага аб'яднання «Мінскі трактары завод імя У. І. Леніна» Іван Дземчанка. — А калі замест чаравікаў трэба змяніць, не выключаючы рубільнік, сотні адзінак складанейшага абсталявання, цэлыя канвееры, з якіх ужо сёння кожныя 3,5 мінуты сыходзіць вядомы ва ўсім свеце трактар «Беларусь»? Вось так, прыкладна, можна ўявіць складанасць маючай адбыцца рэканструкцыі прадпрыемства, — каменціруе ўласнае параўнанне мой субяседнік, але тут жа вяртаецца да больш звыклай мовы лічбаў:

— К 1990 году плануецца амаль на трэць у параўнанні з цяперашнім павялічыць вытворчасць трактароў. У свеце няма роўных па маштабу прадпрыемстваў, якія б выраблялі універсальныя прапашныя колавыя трактары. Варта адзначыць і другое: пачнецца масавы выпуск прынцыпова новых машын, фактычна, ужо пятага пакалення «Беларусаў». Нарэшце, комплексная рэканструкцыя павінна палепшыць умовы працы рабочых, ліквідаваць, у асноўным, ручную і цяжкую фізічную працу. Поўнае ажыццяўленне праграмы, па сутнасці, роўнае ўводу ў строй новага прадпрыемства.

Рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне, лічаць мінскія трактарабудаўнікі, — працэс няспынны: жывём, пакуль удасканальваемся. За 38 гадоў сваёй гісторыі завод тройчы перааснашчаўся карэнным чынам. Пачатая рэканструкцыя — чацвёртая. Яна азначае, гаворачы мовай эканамістаў, што абнаўленне асноўных фондаў і ўвод новых магутнасцей дасягне 50 працэнтаў. Дададзім, што і ў прамежках паміж гэтым штогод абнаўляецца 5—7 працэнтаў парку абсталявання. У выніку ўжо цяпер 65 працэнтаў металарэзнага абсталявання на прадпрыемстве працуе ў аўтаматычным і паўаўтаматычным цыкле. Больш за 85 працэнтаў станкоў уключаны ў аўтаматычныя, паточныя і паточна-механізаваныя лініі. Толькі працягласць заводскіх канвееравў і транспарцёраў — больш за 40 кіламетраў.

Што азначаюць гэтыя працэнты ў рэальнасці, я ўбачыў напрыкладзе ліцейнага цэха № 1 шэрага чыгуну. Маім праваднікам тут быў стрыжаншчык Уладзімір Лушко. Больш за 16 гадоў прапрацаваў ён у «ліцейцы», якая традыцыйна лічылася ледзь ці не самым цяжкім участкам па ўмовах працы. Многа было ручных аперацый, пастаянна высокая тэмпература і загазаванасць. Тлумачылася гэта тым, што цэх значна перакрыў праектную магутнасць, настолькі высокай была патрэба ў яго прадукцыі.

Сёння пра старую «ліцейку» помнім толькі мы, ветэраны, гаворыць рабочы. Пры рэканструкцыі зніклі з цэху гарачыя печы вертыкальнага сушэння, ручная фармоўка, нарыхтоўка фармовачных сумесяў. На новым аўтаматычным і паўаўтаматычным абсталяванні працаваць значна лягчэй. Прадукцыйнасць на асобных аперацыях узрасла ў пяць і больш разоў. Павысілася якасць адлівак. Натуральна, што ўсё гэта добра адбілася на нашай зарплаце, дадаў Уладзімір Лушко.

— І ўсё ж рэканструкцыя — не проста механічная замена старога абсталявання, хоць нават ад аднаго гэтага выйграюць і рабочыя, і слава маркі, — тлумачыць сутнасць праходзячых на заводзе перамен Іван Дземчанка. — Гэта комплексны працэс, які патрабуе пошуку і ўкаранення прынцыпова новых ідэй на ўсіх участках вытворчасці, яго падрыхтоўкі і забеспячэння.

Не дзіўна, што своеасаблівымі рэкардсменамі па акумуляцыі новых ідэй аказаліся канструктары. Каб не адстаць ад жыцця, ім даводзіцца гадоў на 10—15 апярэджваць яго. Сёння на канвеерах завода розныя мадыфікацыі трактара МТЗ-80/82. Па асноўных тэхніка-эканамічных паказчыках — магутнасці, паліўнай эканамічнасці, вазе, рэсурсу да першага капітальнага рамонту — яны адпавядаюць узроўню сучаснага сусветнага трактарабудавання, а па ўдзельнай масе, універсальнасці, колькасці перадач, наяўнасці рабочага і дапаможнага абсталявання — лепшыя за сусветныя аналагі. Не выпадкова таму беларускія трактары працуюць больш чым у 70 краінах. Але для канструктараў і гэтыя мадэлі — дзень учарашні.

Распрацаваны яшчэ больш універсальныя і энерганасычаныя трактары. Іх кампановачная схема, шырокі набор вузлоў рабочага абсталявання ў сукупнасці з камплектам сельскагаспадарчых машын гарантуюць значнае павелічэнне шырыні захвату на прапашных работах. Гэта дазволіць, напрыклад, прымяняць дванаццацірадную сістэму вырошчвання кукурузы, васемнаццацірадную — буракоў , шаснаццацірадную — бульбы. Мотарэсурс ужо выпускаемых машын к канцу пяцігодкі (1985 год) павінен узрасці да 10 тысяч гадзін. Інакш кажучы, кожны трактар, працуючы няспынна круглыя суткі, будзе бездакорна служыць больш чым год!

Разам з канструктарамі над мадэлямі новых трактароў нямала папрацавалі і дызайнеры. Трактар камфартабельны, зручны ў абслугоўванні, лёгкі пры кіраванні.

Канструктар, скажаце вы, можа хоць сёння прапанаваць машыну, тэхнічныя характарыстыкі якой будуць на некалькі парадкаў вышэй існуючых. Але новая канструкцыя заўсёды павінна арыентавацца на рэальны тэхналагічны ўзровень. Нездарма ва ўсім свеце спосаб рэалізацыі ідэі (тое, што і ёсць уласна тэхналогія) цэніцца вышэй за саму ідэю. На трактарным заводзе выдатна разумеюць гэта. Таму ўдасканаленне тэхналогіі ў перыяд комплекснай рэканструкцыі ставіцца на першы план.

Яшчэ нядаўна праблема заключалася ў тым, каб «састыкаваць» інтарэсы навукі з яе фундаментальнымі маштабамі з інтарэсамі канкрэтнай вытворчасці. Сёння для трактаразаводцаў такой праблемы практычна не існуе. На МТЗ створаны свой навукова-даследчы цэнтр, задача якога, апрача ўласных распрацовак, — прыцягваць да навукова-даследчых работ акадэмічныя і галіновыя інстытуты. Падобная творчая садружнасць (а ў яе арбіту ўцягнута ўсяго каля 50 навуковых цэнтраў краіны) забяспечвае тэхналагічнае і тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці.

Размова пра асаблівасці рэканструкцыі працягвалася ў кабінеце намесніка сакратара парткома прадпрыемства Мікалая Стукача.

— У падрыхтоўцы праекта рэканструкцыі ўдзельнічалі спецыялісты ўсіх асноўных службаў завода, — гаворыць Мікалай Стукач. — І ўсё-такі, калі гэты дакумент абмяркоўвалі камуністы, было ўнесена нямала ўдакладненняў. Яны датычыліся сацыяльных бакоў праекта. Тэхнічнае перааснашчэнне больш цесна ўвязвалася з мерамі па далейшаму паляпшэнню ўмоў працы, быту і адпачынку трактаразаводцаў. Намецілі скараціць і тэрміны выканання некаторых работ. Для гэтага многія брыгады, змены і ўчасткі добраахвотна абавязаліся адпрацаваць дадаткова сотні гадзін на будаўніцтве. Шэфства над праграмай абнаўлення вытворчасці ўзялі і камсамольцы завода. У паспяховым выніку рэканструкцыі зацікаўлены ўсе.

В. УЛАДЗІМІРАЎ.



Трэць тэрыторыі нашай рэспублікі займаюць лясы. Безгаспадарчаму іх выкарыстанню ўжо даўно пакладзены канец. Багаццямі зялёнай нівы мы распараджаемся ашчадна, з найбольшай карысцю для народнай гаспадаркі.

НА ЗДЫМКАХ: брыгада нарыхтоўшчыкаў Чэрыкаўскага лесапункта, што на Магілёўшчыне; адгрузка драўніны прадпрыемствам краіны.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

КОЛЬКІ ГАДОЎ ПАВІНЕН ВУЧЫЦЦА ЎРАЧ

МАЛАЯ МЕДЫЦЫНСКАЯ АКАДЭМІЯ

Звыш тысячы ўрачоў штогод выпускаюць медыцынскія вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі. Затым не радзей чым раз у пяць гадоў яны зноў «садзяцца за парту».

— Хачу напомніць, — гаворыць рэктар Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў прафесар Аляксандр Руцкі, — выказванне Гіпакрата: «Мастацтва ўрача бясконцае». Пазней, праз некалькі стагоддзяў, вядомы рускі медык Мацвей Мудроў пісаў: «Няма ўрачоў, якія скончылі сваю навуку».

Мы лічым, што кожны медыцынскі работнік павінен перыядычна праходзіць курсы павышэння кваліфікацыі, каб расшыраць і паглыбляць свае веды. Прычым у наш час гэта асабліва важна, паколькі хутка растуць магчымасці медыцыны, расшыраецца сетка спецыялізаваных цэнтраў, аснашчаных абсталяваннем, праца з якім патрабуе спецыяльных навыкаў.

— Як арганізаваны вучэбны працэс у вашым інстытуце?

— Мы праводзім больш двухсот цыклаў спецыялізацыі і ўдасканалення. Працягваюцца яны ад пяці месяцаў да года. Слухачам прапаноўваюцца лекцыі, прысвечаныя найбольш важным тэарэтычным праблемам медыцынскай навукі. Яны ўдзельнічаюць у канферэнцыях, семінарах, якімі кіруюць найбольш вопытныя спецыялісты — у інстытуце выкладаюць 40 дактароў навук і прафесараў, больш за 150 кандыдатаў навук. Мы маем васемнаццаць клінічных баз, дзе праводзіцца стажыроўка.

— Я быў сведкам, як у адзін з мінскіх стацыянараў даставілі хворага, у якога была дыягнаставана анеўрызма аорты. Слухачы вашага інстытута ўдзельнічалі ў абмеркаванні плана аперацыі, а затым у якасці асістэнтаў — і ў ёй самой. Навошта? Большасць жа з іх працуе на перыферыі, дзе такія аперацыі не робяць. Наколькі мне вядома, пакуль яны пад сілу толькі нямногім сталічным хірургам?

— Удзел у лячэнні хворага, аб якім вы гаворыце, несумненна дапамог маладым урачам больш ясна ўявіць сабе ўсю карціну хваробы, прасачыць стадыі яе развіцця — пад скальпелем часам відаць тое, што не выявіш ніякімі прыборамі. Такі вопыт у будучыні дазволіць ім больш упэўнена распазнаваць гэтую немач сярод соцень іншых, падобных. Вы, дарэчы, прывялі выключны выпадак. Увогуле ж, прыязджаючыя да нас на вучобу хірургі аперыруюць самі, а асісціруюць ім прафесары.

— Ваш інстытут урачы між сабой іншы раз называюць «малой медыцынскай акадэміяй». Чаму?

— Гэта, вядома, занадта смела... Хоць, як гаворыцца, у кожным жарце ёсць доля праўды. Па-першае, нашы кафедры (а іх сорак сем) узначальваюць вядучыя вучоныя рэспублікі. Па-другое, мы маем магутную навуковую базу, Цэнтральную навукова - даследчую лабараторыю, дзе праводзяцца сур'ёзныя тэарэтычныя даследаванні. Назаву такую лічбу: за апошнія пяць гадоў супрацоўнікі інстытута атрымалі 27 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы, апублікавалі 106 манаграфій і падручнікаў.

— Сярод тых, хто прыбыў на вучобу, я сустрэў урача з палярнага горада Кейта. Чаму ён прыехаў сюды? У краіне ж ёсць яшчэ 15 такіх інстытутаў, і некаторыя з іх размешчаны значна бліжэй да яго дому?

— Міністэрства аховы здароўя СССР распрацоўвае адзіны вучэбна - вытворчы план, згодна з якім размяркоўвае накіраванні на курсы павышэння кваліфікацыі. Пры гэтым улічваецца жаданне ўрачоў прайсці ўдасканаленне ў той або іншай навучальнай установе. Не палічыце гэта за няскромнасць, але Беларускі інстытут карыстаецца папулярнасцю, і да нас прыязджаюць нават з тых месцаў, дзе ёсць свае інстытуты. Падарожжа да Мінска, таксама як і навучанне ў інстытуце, не звязана для саміх слухачоў з выдаткамі: іх бярэ на сябе дзяржава. Акрамя таго, за ўвесь час вучобы яны атрымліваюць 100 працэнтаў сваёй заработнай платы.

— Якія, на ваш погляд, тэндэнцыі ўласцівыя цяпер арганізацыі аховы здароўя Беларусі?

— Самае, бадай, істотнае — адмова ад практыкі будаўніцтва як мага большай колькасці малых бальніц, амбулаторый і арганізацыя буйных лячэбных комплексаў многагаліновай, калі можна так сказаць, медыцыны. У апошнія гады ў Беларусі пабудаваны 16 цэнтраў спецыялізаванай медыцынскай дапамогі і 70 міжраённых аддзяленняў. У іх ёсць алергалагічныя і гематалагічныя, гастраэнтэралагічныя і нефралагічныя службы. Спецыялізацыя медыцыны запатрабавала стварэння ў нашым інстытуце новых кафедр. Адначасова павялічылася і наша клінічная база. Цяпер мы маем больш за шэсць тысяч месцаў у стацыянарах Мінска.

Юрый САПАЖКОЎ.



Гродзенскі фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Юбілейны», новы будынак якога ўпрыгожыў вуліцу Горкага, лічыцца адным з лепшых у рэспубліцы. У ім два плавальныя басейны — 50-метровы на восем дарожак для дарослых і малая ванна для дзяцей. Працуюць сауны, працэдурна-масажнае аддзяленне, дзе можна прыняць розныя душы, падводны і гідрамасаж. Ажыўлена па вечарах і ў спартыўнай зале комплексу. Цяпер у «Юбілейным» займаецца амаль паўтары тысячы дзяцей, падлеткаў і дарослых.

НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд Гродзенскага фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

Фота А. ПЕРАХОДА, Г. СЯМЁНАВА.

ЗАНЯТКІ НА КУРСАХ БЫЛІ КАРЫСНЫМІ

УРУЧАЕЦЦА ПАСВЕДЧАННЕ...

Пасведчанне аб заканчэнні курсаў уручаецца Яўгеніі Марозавай... Аляксандру Коніку... Таццяне дэ Гротэ...

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры Фёдар Жыгалаў шчыра віншуе тых, хто займаўся тут на курсах па гісторыі і культуры Беларусі, па вывучэнні мовы.

— Вялікае вам дзякуй,— усхвалявана адказваюць госці.— Колькі будзем жыць, не забудзем Беларусь. Асаблівая наша падзяка за атрыманыя веды.

Такія курсы ў нашай рэспубліцы праводзяцца не ўпершыню, і тым, хто іх арганізоўвае, цікава было ведаць, што новага пачарпнулі для сябе з сустрэч, лекцый слухачы, якую карысць прынеслі ім заняткі.

Вера Ялфімава, наша суайчынніца з Бельгіі, надзвычай задаволена лекцыямі па мове. Асабліва карысным аказаўся курс «Методыка вывучэння рускай мовы». Чаму менавіта гэтыя лекцыі, цікаўлюся ў госці.

— Таму што я сама спрабую вучыць бельгійцаў рускай мове,— адказвае яна.— Кожную суботу збіраемся на дзве гадзіны. У нас няма такіх аўдыторый, такіх тэхнічных сродкаў, як тут. Мы арандуем невялікае памяшканне. У мяне дванаццаць вучняў самага рознага ўзросту. Ёсць маладыя, а іншым ужо за пяцьдзесят. Сярод іх сябры таварыства «Бельгія—СССР» і проста жадаючыя вывучаць мову маёй Радзімы. Узровень іх падрыхтоўкі таксама неаднолькавы: ад сярэдняй да вышэйшай адукацыі.

Вера Ялфімава сказала, што курсы далі ёй для далейшай работы вельмі многа. І можа самае галоўнае: яна ведае цяпер, куды можна звярнуцца за кніжкай, парадай, калі ўзнікнуць цяжкасці ці складаныя пытанні.

Вялікую карысць прынеслі заняткі і нашаму земляку з Вялікабрытаніі Мікалаю Янушэвічу, які нарадзіўся і вырас у Беларусі. «Першыя словы, якія я пачуў ад маці, гаворыць М. Янушэвіч, былі на беларускай мове, і я лічу яе роднай. Але без рускай мовы таксама ніяк немагчыма. У нашай групе, напрыклад, ёсць рускія, беларусы, украінцы, бельгійцы, амерыканцы. А тут усе гаворым на адной мове — рускай і добра разумеем адзін аднаго.

Я займаюся перакладамі з рускай на англійскую мову і таму меў патрэбу ўдасканаліць свае веды. Курсамі задаволены. Лекцыі чыталіся вельмі розныя. Для мяне з'явілася адкрыццём усё, што я даведаўся па гісторыі, філасофіі, літаратуры, культуры Беларусі. Прызнаюся, што, бадай, упершыню ў жыцці слухаў лекцыі на такім высокім узроўні. Вельмі ўдзячны ўсім, хто даў мне магчымасць займацца на курсах».

У сваёй лекцыі, напрыклад, вучоны Энгельс Дарашэвіч расказаў аб зараджэнні і развіцці на Беларусі філасофскай думкі, аб своеасаблівасці і высокім узроўні нашай нацыянальнай культуры, аб тым, з якой любоўю і клопатам ставяцца сёння беларусы да сваёй духоўнай спадчыны.

Запомнілася ўдзельнікам курсаў і сустрэча з народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім, уся творчасць якога—пратэст супраць вайны, абвінавачанне фашызму, які нясе чалавецтву смерць і пакуты.

З пісьменнікам Іванам Шамякіным некаторыя з нашых гасцей ужо былі знаёмыя. Ён сам у зручным выпадку любіць прыгадаць, як у час сваёй паездкі ў Бельгію быў запрошаны ў Саюз савецкіх грамадзян у Бруселі, пабываў у іншых аддзелах, сустракаўся з актывістамі.

На прапанову сустрэцца з удзельнікамі курсаў Іван Пятровіч ахвотна згадзіўся. Яго добразычлівая ўсмешка, прастата адразу стварылі атмасферу давер'я і сардэчнасці. Шлях Івана Шамякіна ў літаратуру тыповы для дзесяткаў сучасных беларускіх пісьменнікаў. Сын селяніна, вучыўся ў школе, потым тэхнікуме. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў воінам, абараняў сваю зямлю ад ворага. Іван Шамякін расказаў пра Саюз пісьменнікаў Беларусі, у якім больш за 300 членаў, пра сваю працу ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (ён узначаліў гэты творчы калектыў, прыняўшы эстафету ад Петруся Броўкі), адказаў на шматлікія пытанні.

Тэарэтычныя заняткі былі заўсёды ў першай палавіне дня, а пасля абеду і адпачынку ўдзельнікі курсаў ехалі на экскурсію ў які-небудзь музей, знаёміліся з творчымі калектывамі, наведвалі тэатры, канцэртныя залы, хадзілі па вуліцах, заходзілі ў магазіны. Адным словам, знаёміліся з тым, як жывуць, што думаюць, да чаго імкнуцца савецкія людзі.

— Дзякуючы курсам, — сказала Таня дэ Гротэ, — я зразумела, што для мяне Савецкі Саюз не толькі месца, дзе жывуць бабуля і дзядуля. Гэта штосьці значна большае.

Сустрэча з гэтай маладой жанчынай у Мінску, у сценах інстытута, мела нейкі сімвалічны сэнс. Справа ў тым, што яе маці, Нэля Францава, была сярод удзельнікаў самых першых курсаў, што праводзіліся Міністэрствам культуры БССР і Беларускім таварыствам «Радзіма» для зарубежных землякоў. Жыццярадасную Нэлю добра запомнілі выкладчыкі інстытута, усе, хто з ёю сустракаўся. Для Нэлі Францавай Савецкі Саюз назаўсёды застаўся адзінай Радзімай, і сваю любоў да яе яна перадала і дочкам.

Аляксандр Конік прыехаў з Аўстрыі, дзе апынуўся ў гады другой сусветнай вайны. Родам жа ён з былой Заходняй Украіны. У свой час ён не меў магчымасці вывучаць рускую мову, бо займаўся ў польскай школе. Потым, ужо ў Вене, яго вучыў рускі сябар.

— Для мяне карысць ад курсаў двайная, — ахвотна расказваў Аляксандр Конік.— Раней пра Беларусь я літаральна нічога не чуў. Цяпер я многа даведаўся пра яе багатую культуру, самабытнае мастацтва. Для мяне гэта было адкрыццём. Мы назіралі, як Мінск будуецца. Дзень і ноч рухаюцца краны. Уяўляеш, як ён выглядаў бы, каб не тыя разбурэнні, што прынесла яму мінулая вайна, і каб вашай краіне не трэба было траціць грошы на абарону.

Удзельнікі курсаў былі ўражаны добразычлівасцю, гасціннасцю беларусаў, ім спадабалася атмасфера дружбы і спакою, у якой жывуць савецкія людзі.

У той апошні дзень, калі землякам уручалі пасведчанні аб заканчэнні курсаў, сустрэўшыся з Ксеніяй Кіорпе ў калідоры інстытута, я спытала: «Ну, як справы? — «Дрэнна, — адказала яна. — Ад'язджаць пара».

Гэта добра, што шкада пакідаць Мінск, падумала я. Значыць, тры тыдні пакінулі след у душы.

Дзіяна ЧАРКАСАВА.

АНТЫВАЕННАЯ МАНІФЕСТАЦЫЯ Ў МІНСКУ

«Мір народам зямлі!», «Не — ядзернай вайне!», «Няхай жыве міралюбівая палітыка КПСС!», «Не» — новым ракетам ў Еўропе!» — такія лозунгі неслі 29 кастрычніка мінчане — удзельнікі маніфестацыі, якая праводзілася ў рамках Тыдня дзеянняў за раззбраенне. Аб'яднаныя агульным імкненнем адстаяць і захаваць мір на планеце ў калонах плячом да пляча ішлі людзі розных пакаленняў. Усе яны адзіныя ў падтрымцы міралюбівых ініцыятыў Савецкага Саюза, у сваім гарачым адабрэнні Заявы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ю. У. Андропава.

На плошчах горада адбыліся мнагалюдныя мітынгі.

— Мы сабраліся тут, каб выказаць свой гнеўны пратэст супраць адкрытай падрыхтоўкі адміністрацыі Злучаных Штатаў на чале з Рэйганам да новай сусветнай вайны, заявіць аб сваёй вернасці справе рэвалюцыі, рашучасці адстаяць мір,— сказаў сталевар Мінскага аўтазавода У. Малюкоў на мітынгу на плошчы Леніна. — Мы горача падтрымліваем курс КПСС і дзяржавы на спыненне гонкі ўзбраенняў і раззбраенне.

Гнеўным папярэджаннем авантурыстычнаму курсу дыктата і насілля рэйганаўскай адміністрацыі прагучалі выступленні рэктара Мінскага медыцынскага інстытута А. Ключарова, будаўніка С. Акуліча, настаўніцы, маці пяцярых дзяцей В. Глаз, студэнткі М. Браваранка...

У маніфестацыях і мітынгах удзельнічала звыш 70 тысяч мінчан. Яны аднадушна прынялі заяву, у якой выказаны рашучы пратэст супраць планаў адміністрацыі Рэйгана і агрэсіўных колаў НАТО размясціць у Еўропе ракеты «Першынг-2» і крылатыя ракеты.

Беларускі народ, сказана далей у заяве, які паклаў на алтар перамогі над гітлераўскім фашызмам жыццё кожнага чацвёртага грамадзяніна рэспублікі, добра ўяўляе, што нясе чалавецтву ядзерная вайна. Мы рашуча патрабуем спыніць пагрозу ядзернай катастрофы.

У дакуменце выказана аднадушная падтрымка паслядоўнага курсу КПСС і Савецкага ўрада, накіраванага на спыненне гонкі ўзбраенняў і раззбраенне.

Мнагалюдныя мітынгі, сходы грамадскасці ў рамках Тыдня дзеянняў за раззбраенне прайшлі таксама ў Віцебску, Магілёве, іншых гарадах і вёсках Беларусі.

НА ЗДЫМКУ: антываенная маніфестацыя ў Мінску.

Фота С. КРЫЦКАГА.

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў АХОВЕ БІЯСФЕРЫ

Мы паведамлялі ўжо, што ў Мінску адбыўся Першы міжнародны кангрэс па біясферных запаведніках — БІОРЭСКО-83. У ім прымалі ўдзел 112 вядомых вучоных з 48 краін.

Карэспандэнт Агенцтва друку Навіны папрасіў кіраўніка савецкай дэлегацыі намесніка міністра сельскай гаспадаркі СССР Віктара ШАВЯЛУХУ падзяліцца сваімі ўражаннямі аб рабоце кангрэса.

— Гэта, бадай, быў самы прадстаўнічы форум з усіх, якія за апошнія дзесяць гадоў збіраліся, каб вывучыць праблему біясферных запаведнікаў — сказаў В. Шавялуха.— Вучоныя абмяняліся думкамі і ўнеслі істотны ўклад у выпрацоўку адзінай канцэпцыі па стварэнню сусветнай сеткі біясферных запаведнікаў, што з'яўляецца ключавой часткай Міжурадавай праграмы ЮНЕСКО ў галіне навакольнага асяроддзя «Чалавек і біясфера» (МАБ). На сённяшні дзень у 62 краінах налічваецца 226 біясферных запаведнікаў, больш тысячы тэрытарыяльных ахоўваемых зон прыроды. Многа гэта ці мала? Прывяду такія факты. Усяго на зямным шары існуе каля 12 мільёнаў відаў жывёл і раслін. З іх вывучана пакуль крыху больш за паўтара мільёна. Генафонд планеты знікае хутчэй, чым навука паспявае яго вывучыць, каб паставіць на службу чалавецтву. У «Чырвоную кнігу» прыроды ўвайшло каля 2 000 відаў жывёл, птушак, рэптылій, насякомых, рыб. Гэта вельмі сумны факт. Ён сведчыць пра тое, што ў глабальным маштабе яшчэ не знойдзены кампраміс паміж выкарыстаннем прыродных рэсурсаў і захаваннем іх.

Мінскі кангрэс даў навуковыя рэкамендацыі, якія ў нейкай ступені памогуць паправіць справу. На пасяджэннях трох секцый БІОРЭСКО-83 абмеркаваны праблемы кіравання біясфернымі запаведнікамі, узмацнення ролі гэтых рэзерваў прыроды ў прынясенні карысці рэгіёнам, крытэрыі выкарыстання іх у сацыяльнай і эканамічнай функцыях.

— Мне прыемна, — працягвае В. Шавялуха, — што вельмі многія ўдзельнікі БІОРЭСКО-83 адзначылі вялікі ўклад у яго работу Савецкага Саюза. Арганізатары кангрэса ахвотна згадзіліся правесці яго ў нашай краіне, дзе асноўнымі прынцыпамі, на якіх базіруецца экалагічны светапогляд, з'яўляюцца захаванне ўсёй відавой разнастайнасці раслін і жывёл і забеспячэнне багацця і цэласнасці іх натуральных згуртаванняў у працэсе рацыянальнага выкарыстання. У нашай краіне 144 запаведнікі агульнай плошчай звыш 13,3 мільёна гектараў. Землі, што займаюцца імі, навечна выключаны з гаспадарчага карыстання. На іх ажыццяўляецца адзіны і строгі ахоўны рэжым. Біясферных запаведнікаў у нашай краіне пакуль сем. У бліжэйшай будучыні да гэтай колькасці прыбавяцца яшчэ дзесяць. Навуковая база захавання рэдкіх відаў і тых, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, прадстаўлена ў спецыяльным дзяржаўным дакуменце — «Чырвонай кнізе». Другое выданне яе ўключае 457 відаў жывёл, 603— сасудзістых раслін, 20— грыбоў-макраміцэтаў, 29— лішайнікаў, 32 віды — лісцесцябловых імхоў. У другім выданні кнігі з'явіліся першыя «зялёныя» аркушы. Іх «насяляюць» жывёлы, пераведзеныя ў катэгорыю ўзноўленых. Гэта зубр, новазямельскі паўночны алень, ладажская нерпа, малы лебедзь, белашчокая казарка, каўказскі цецярук, ружовая чайка і сярэдне-

КАК ЖЕ СЛУЧИЛОСЬ, ЧТО ЗАПАДНАЯ ЕВРОПА ДАЛА СОГЛАСИЕ НА РАЗМЕЩЕНИЕ АМЕРИКАНСКИХ РАКЕТ?

ШАГ К САМОУБИЙСТВУ

«С вашингтонского мостика операция по установке в Европе... американских ядерных ракет смотрится как предельно простая и максимально выгодная для США — выгодная за счет Европы. Европейские союзники США рассматриваются в качестве заложников. Откровенная политика, но циничная. Но вот что непонятно: задумываются ли над этим те европейские политические деятели, которые, пренебрегая интересами своих народов, интересами мира, помогают осуществлению амбициозных милитаристских планов администрации США?»

Этот вопрос, заданный в данном случае Юрием Андроповым в его Заявлении (посвященное оценке курса в международных делах администрации США, Заявление Генерального секретаря ЦК КПСС, Председателя Президиума Верховного Совета СССР было опубликовано в советских газетах 29 сентября 1983 года), не является новым вопросом. Но сегодня, в преддверии декабря, выбранного руководством НАТО для начала размещения «евроракет», он звучит остро актуально, злободневно, как никогда, тревожно. Потому что качественно новые «евроракеты» — это, безусловно, качественно новая угроза Европе: всей Европе, в том числе и Западной. Неспроста один из авторитетных американских специалистов по военным проблемам, бывший директор национального агентства по контролю над вооружениями и разоружению Пол Уорнке заявляет со всей прямотой: «Будь я европейцем, то делал бы все мыслимое, чтобы не допустить размещения на своей территории всех видов оружия, которые... вновь делают войну возможной и даже, чего доброго, поддающейся выигрышу».

Это одно из длинного ряда утверждений и свидетельств такого рода, при том, что число их не уменьшается, но, напротив, растет все быстрее. И не реже, а чаще прямо или подспудно звучит в них вопрос, поставленный впервые еще после декабрьской, 1979 года, сессии совета НАТО, принявшей «евроракетное» решение: как же случилось, что Западная Европа поддалась американскому давлению, согласилась на размещение в пяти европейских странах ракет «Першинг-2» и крылатых ракет, а значит, и на превращение себя в мишень для ответного удара?

Определенное число государственных и политических деятелей в Западной Европе, осознав наконец, насколько грозной становится ныне ситуация, пытается как-то оправдать одобрение своими странами американского плана развертывания новых ракет принятием советом НАТО в 1979 году именно «двойного решения», предполагавшего проведение с СССР переговоров о разоружении, а не одно автоматическое «довооружение». Оправдывая позицию социал-демократической партии Германии, ее федеральный секретарь Эгон Бар писал, в частности: «Мы были уверены, что двойное решение поможет преодолеть сопротивление Договору ОСВ-2 в американском сенате. Если бы мы знали, что Договор ОСВ-2 не будет ратифицирован, то двойное решение никогда не появилось бы на свет».

Высказывание Бара лишний раз выявляет двуличие правящих кругов США, которые загнали в тупик проходящие в Женеве советско-американские переговоры по поводу ядерных ракет средней дальности в Европе, а тем временем ведут усиленную подготовку к переброске на европейский континент этих ракет. Их обещание, данное в момент принятия «двойного решения» НАТО, было заведомым обманом. Разумеется, в определенной степени оно сыграло роль в решении ряда западноевропейских политиков проштамповать согласием жесткое требование США в 1979 году.

Но все-таки главные причины того, что западноевропейские страны—участницы НАТО пошли на самоубийственный для них шаг — дать добро на размещение у себя американских ядерных ракет средней дальности,— другие. На мой взгляд, их две. Первая — широкое использование американцами в то время подновленного мифа о «советской военной угрозе», с помощью которого милитаристские круги всегда обеспечивали условия для новых и новых туров гонки вооружений в Европе.

Исторические аналогии в этом смысле совершенно естественны. Вспомним, например, первые годы «холодной войны». Тогда как совершенно достоверное подавалось утверждение, будто бы СССР сосредоточил для нападения на Западную Европу 175—200 дивизий. Под этим предлогом американцы забили склады на европейском континенте тысячами боеголовок тактического атомного оружия, поставив европейские страны перед перспективой полного уничтожения в случае военного конфликта с Востоком. Но вот Джон Кеннеди, став президентом США, поручает новому министру обороны Р. Макнамаре тщательно проверить и доложить, сколько же у СССР в действительности боеготовых дивизий. Сообщение Макнамары гласит: дивизий этих вдвое меньше, чем утверждалось.

Точно так же было и с домыслами о «ракетной бреши», когда число советских межконтинентальных ракет отнюдь не по незнанию завышалось ни много ни мало — в 30 раз. Гонка вооружений получила на рубеже 50-х—60-х годов мощное ускорение, американцы форсировали ракетную программу. И вот результат: президент Джонсон в 1964 году констатировал, что «у Советского Союза ракет намного меньше и у него нет ничего эквивалентного нашим «Поларисам». А президент Никсон в послании конгрессу 18 февраля 1970 года признал, что «угрозу» со стороны Советского Союза в конце 50-х годов «сильно завышали». Признание недорого стоило: дезинформировав миллионы людей, США в свое время, во-первых, прочно вбили многим из них в голову тревогу по поводу «советской угрозы», а во-вторых, заполучили, легко смяв на волне истерии ряды внутренних противников гонки вооружений, все, чего добивались. Ракетная сверхпрограмма оказалась выполненной.

Ситуация такого рода не раз повторялась в 60-е годы. Но особенно часто она повторяется с конца 70-х годов, когда милитаристские круги перешли в наступление против разрядки. Поскольку работу над новой ракетой для театра военных действий США начали еще в 1969 году, а в 1975 году в бюджете армии США создание ракеты «Першинг-2» было уже выделено в самостоятельную программу, им крайне важно было создать шумиху вокруг ракет СС-20 . Вот эти ракеты и стали изображаться как некое чудо-оружие, с помощью которого СССР-де получает возможность шантажировать страны Западной Европы.

В действительности многие компетентные специалисты Запада с самого начала называли и продолжают называть такие утверждения полным абсурдом. Генерал в отставке Г. Бастиан (ФРГ) в книге «Атомная смерть или Европейское сообщество безопасности», изданной в минувшем году, писал, например: развертывание ракет СС-20 не представляет собой ничего нового. Произошла лишь модернизация нацеленных уже 20 лет на Западную Европу ракет СС-4 и СС-5 , по поводу которых «никто там не терял сон». И сейчас у Запада в Европе имеется преимущество по ядерным боеголовкам, учитывая все направленные на СССР и способные достичь его территории ядерные силы, расположенные в европейском регионе.

Волна домыслов о «советской угрозе», однако, сделала свое дело: США удалось еще крепче привязать к своей ядерной колеснице западноевропейские страны...

Была, на мой взгляд, и другая причина, повлиявшая в конце 70-х на позицию целого ряда руководителей стран НАТО. Какая? Иллюзорная, как оказалось, надежда на то, что, уступив давлению Вашингтона по части размещения «Першингов-2», они смогут выторговать у него взамен какие-то поблажки для преодоления собственных экономических трудностей. Надежда эта рухнула. Соединенные Штаты продолжают проводить экономический курс, выгодный лишь американским монополиям и наносящий другим странам серьезный ущерб.

Итак, иллюзии развеялись, у миллионов западноевропейцев с глаз уже спали шоры. Теперь и для них, как и для тех, кто с самого начала говорил «нет!» двойному решению, чем дальше, тем тревожнее звучит вопрос: успеют ли еще возобладать силы разума, удастся ли помешать США сорвать переговоры в Женеве и начать размещение антиевропейских «евроракет»?

При крайней сложности и опасности ситуации она еще не безвыходна. Но выход этот искать надо, как и предлагает СССР, в зоне взаимоприемлемых, честных решений. На пути ограничения гонки вооружений, а не придания ей нового ускорения; на пути укрепления безопасности, а не подрыва ее.

Александр ЕФРЕМОВ,
доктор исторических наук.

(АПН).

азіяцкая кобра. Усе гэтыя поспехі, вопыт савецкіх вучоных сталі здабыткам удзельнікаў кангрэса.

Амерыканскім вучоным пад кіраўніцтвам галоўнага эколага Упраўлення лясамі ЗША Дж. Франкліна і іх савецкім калегам на чале з дырэктарам Інстытута эвалюцыі марфалогіі жывёл і экалогіі акадэмікам Уладзімірам Сакаловым удалося з дапамогай картаграфічнага матэрыяла вызначыць у СССР і ЗША запаведнікі-аналагі. Здавалася б, розныя, сфарміраваныя на розных кантынентах экасістэмы ніколі не могуць быць падобнымі. Але запаведнікі-двайнікі ў наяўнасці. Даклад «Сястрынскія біясферныя запаведнікі і прынцыпы іх выбару», прачытаны доктарам біялагічных навук Юрыем Пузачэнкам, быў адным з самых яркіх на кангрэсе.

З выключнай цікавасцю сустрэлі вучоныя расказ прафесара Барыса Вінаградава пра вынікі унікальнага эксперыменту, пачатага ў 1982 годзе,— аэракасмічных здымках 24 савецкіх запаведнікаў, якія выкананы касманаўтам Валянцінам Лебедзевым на «Салюце-7». Па сутнасці, адкрыты новы падыход у вывучэнні экасістэм без умяшання чалавека, без парушэння запаведнага рэжыму.

Першы міжнародны кангрэс па біясферных запаведніках працаваў не толькі ў Мінску, але і непасрэдна на ўлонні прыроды — у Бярэзінскім біясферным запаведніку. Ён славуты тым, што выратаваў ад гібелі папуляцыю бабра. У 1929 годзе тут налічвалася пяць ці шэсць бабрыных сем'яў. Цяпер на рацэ Бярэзіне паўсюль тырчаць з вады купалы бабрыных хатак. Бабры даўно адлоўліваюцца і рассяляюцца ў іншых раёнах краіны. У Бярэзінскім запаведніку выдатна адчуваюць сябе калонія зубраў, якія добраахвотна выбралі сабе гэта месца жыхарства пасля Белавежскай пушчы, дзе засталіся 200 іх сабратоў. Нагадаю: некалькі дзесяткаў гадоў назад зубру ў Еўропе пагражала поўнае знікненне. Замежных вучоных літаральна прывёў у захапленне ўзровень навукова-даследчай работы ў Бярэзінскім запаведніку. Дырэктар аддзела экалагічных даследаванняў ЮНЕСКО Франчэска дзі Кастры назваў яго эталонам, які адпавядае сусветным стандартам. Намеснік прэзідэнта Міжурадавага каардынацыйнага савета МАБ Мішэль Баціс прапанаваў правесці палявыя даследаванні на прыкладзе Бярэзінскага біясферага запаведніка.

Прапановы, вывады, рэкамендацыі вучоных увайшлі ў праект плана дзеянняў па біясферных запаведніках. Ён будзе прадстаўлены Міжнароднаму кансультатыўнаму савету МАБ і перададзены кіруючым органам ЮНЕСКО, ЮНЕП, ФАО, МСОП для рэалізацыі.

Характэрная рыса мінскага БІОРЭСКО — яго антываенная накіраванасць. Успамінаю выдатныя словы касманаўта СССР Валянціна Лебедзева, які прысутнічаў на кангрэсе, аб неабходнасці берагчы ад вайны Зямлю — запаведнік цывілізацыі. Пра тое ж гаварыў дырэктар Нацыянальнага савета навуковых даследаванняў Мексікі Ганзала Хальфтэр. Наш кангрэс, падкрэсліў ён, выходзіць за рамкі навуковай дыскусіі, таму што клопат пра запаведнікі — гэта ў першую чаргу клопат аб міры на планеце, міры на карысць чалавека і біясферы.

Аб неабходнасці «развітога і адначасова чалавечнага міру пры дапамозе супрацоўніцтва, абмену вопытам, ведамі і тэхналогіяй» напісаў у адрас старшыні аргкамітэта СССР сустаршыня праекта МАБ ЗША Вільям П. Грэг. «На жаль,— дадае ён,— па незалежачых ад нас абставінах колькасць удзельнікаў нашай дэлегацыі скарацілася, але гэта не зменшыла ні нашай агульнай цікавасці да кангрэса, ні нашага жадання, каб ён прайшоў паспяхова».

пішуць землякі

ТРЭБА ПРЫСЛУХАЦЦА

Кожнаму нармальнаму чалавеку добра вядома, што сёння ў свеце назапашаны такія арсеналы зброі масавага знішчэння, што ўсё жывое на планеце можа быць знішчана за некалькі гадзін у выпадку ўзнікнення тэрмаядзернага канфлікту паміж дзяржавамі. Вось чаму так важна ў наш час прыслухацца да разумных і абгрунтаваных ініцыятыў Савецкага Саюза. І больш за ўсё іх трэба было б пачуць палітыкам Злучаных Штатаў, якія толькі і робяць, што ўмешваюцца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў у розных кутках зямлі і такім чынам правакуюць у гэтых краінах лакальныя войны.

У Палітычнай дэкларацыі дзяржаў — удзельнікаў Варшаўскага Дагавора ёсць словы аб тым, што кожны народ мае суверэннае права вольна, без якога б там ні было ўмяшання звонку вырашаць, як яму жыць, які мець грамадскі лад, таксама, як і законнае права абараняць свой выбар. Вельмі шкада, што адміністрацыя Рэйгана ніяк не засвоіць гэтую бясспрэчную ісціну і замест таго, каб асудзіць ізраільскіх агрэсараў, сістэматычна аказвае ім дапамогу. Не можа не выклікаць сур'ёзнай занепакоенасці ў людзей добрай волі сіяніская прапаганда ідэі «вышэйшай расы». Гісторыя паказала, да чаго могуць прывесці падобныя тэорыі і ідэалогіі.

Аляксандр КРАСІН.
ЗША.

РАСТЛУМАЧЫЦЬ УСІМ

Даўно ўжо не пісала вам, таму што ў нас на працягу пятнаццаці дзён была ўсеагульная забастоўка. Людзі пратэставалі супраць несправядлівай палітыкі ўрада ў адносінах да рабочага класа. Цэны літаральна на ўсё растуць, а заработная плата застаецца ранейшай. Кінулі працаваць не толькі рабочыя, але і ўсе дзяржаўныя служачыя. Спыніліся ўсе віды транспарту, закрыліся пошты, школы і іншыя ўстановы. А потым прайшоў яшчэ цэлы месяц, пакуль усё ўвайшло ў норму.

Цяпер мы актыўна рыхтуемся да арганізацыі грандыёзнай маніфестацыі «Маршу міру» ў горадзе Бруселі. Зноў будзем пратэставаць супраць размяшчэння ў Бельгіі амерыканскіх ядзерных ракет «Першынг-2». Усё насельніцтва краіны выказваецца супраць вайны, за мір і дружбу паміж усімі народамі. Але не ўсе вераць, што ядзерная вайна можа пачацца, і таму абыякава ставяцца да барацьбы за мір. Такім людзям даводзіцца многае тлумачыць і даказваць. Аднак большасць прымае ў гэтай барацьбе самы актыўны ўдзел. Варта сказаць, што нягледзячы на прапагандысцкую шуміху і «халодную вайну» людзі ў нашым горадзе вельмі дружалюбна ставяцца да Савецкага Саюза і культурныя мерапрыемствы нашага аддзела ССГБ заўсёды карыстаюцца вялікім поспехам.

Марыя ГАРОХ.
Бельгія.

Знаёмім з лаўрэатамі-82

КЛОПАТЫ І СУМНЕННІ РЭЖЫСЁРА ЗАБЕЛЫ

...Уладзімір Забела вырашыў пайсці ў адпачынак восенню. Калі, здаецца, супакойваюцца і людзі, і сама прырода. Ад гарачага лета застаецца чырвань сонца на дрэвах, на траве, у полі.

Колькі дзён яго нешта трывожыла, перашкаджала сканцэнтравацца. Ён ішоў па сцяжыне, узіраючыся ў кустоўе, траву, нібыта там спадзяваўся знайсці адказ, адшукаць згублены спакой.

У прыцемках добра думаецца. Спакой у прыродзе ласкава кладзецца на душу, якая ад штодзённага напружання і клопатаў стамілася. Некаторыя простыя пытанні, якія на пачатку года здаліся б вельмі простымі, цяпер нервавалі. Забела злаваў, і ледзь сілы хапала, каб стрымаць сябе.

Асаблівай стомы ён не адчуваў. Яна была раней, мо, год назад, калі нарэшце скончыў спектакль «Плач перапёлкі» па аднайменнаму раману Івана Чыгрынава.

Спектакль быў гатовы, але Забела яшчэ доўга не мог астыць ад здымачных турбот, хваляванняў. Пасля прыйшло маруднае і нуднае, як восеньскі дождж, чаканне...

Яму, пэўна ж, шанцавала. Амаль адразу пасля дэманстрацыі па Беларускім тэлебачанні ў прэсе з'явіліся рэцэнзіі на работы Уладзіміра Забелы. Былі водгукі на яго тэлеспектаклі ў газетах, часопісах. У іх — кожны пасвойму, але ўвогуле з прыхільнасцю да рэжысёра — крытыкі адзначалі дасягненні ў рабоце над тэлевізійным спектаклем.

...Сцяжынка бегла праз рэчкі, узгоркі, чаплялася за вербалоз. Забела глядзеў па баках, міжволі вызначаючы кадры, панарамы, якія б маглі спатрэбіцца ў будучым спектаклі. Уладзімір Паўлавіч прыгадаў, як яго хвалілі год назад, і ўсміхнуўся. Вядома, трэба гэта забыць. Як кажуць, былая слава доўга не грэе. Нават калі яго віншавалі з прысуджэннем Дзяржаўнай прэміі БССР, ён ужо думаў пра будучы спектакль паводле аповесці Віктара Казько «Суд у Слабадзе».

Штораз, як пачынаў новую работу, перад ім востра ўзнікала пытанне: якую форму знайсці, каб думка пісьменніка, яго перажыванні, пачуцці герояў рамана ці аповесці сталі блізкімі гледачу. Пэўна, гэты клопат ёсць у кожнага рэжысёра. Інакш, відаць, нельга. Уладзімір Забела заўсёды шукаў сваю форму арганізацыі тэлеспектакля і знаходзіў яе. Праўда, напачатку былі спробы не зусім удалыя, як, напрыклад, у тэлеспектаклі «І нічога ўзамен» па аповесці Алеся Савіцкага. З цягам часу ён зразумеў, што ў гэтай пастаноўцы было больш тэатральнага, чым тэлевізійнага.

Што, ж не ўсё адразу прыходзіць, трэба многа працаваць і бясконца аналізаваць зробленае, каб менш было памылак, хібаў, каб людзі захацелі яшчэ і яшчэ раз глядзець тэлевізійныя спектаклі. А яны для яго, як дзеці, і іх немагчыма забыць. Бо кожны спектакль стаў часткай жыцця, увайшоў у душу.



...Уладзімір Паўлавіч незаўважна для сябе мінуў лагчыну, поўную сівога туману, у якім нібыта плавалі дрэвы, прайшоў узгорак. Неспадзеўкі адкрылася возера, спакойнае і ціхае, як быццам яно заснула.

Восень была сухая, без дажджоў. Расы штосьці не відаць. Ён асцярожна падышоў да вады і прысеў на човен, які быў прывязаны ланцугом да металічнага слупа.

Уладзімір Паўлавіч не разумеў: чаго гэта пацягнула на ўспаміны. Мо, прырода дзейнічала на яго, настройвала на развагі. Недзе пакуль несвядома, ён у думках аналізаваў свае спектаклі, нібыта нанава манціраваў іх, агучваў. У галаве праляцелі радкі Аркадзя Куляшова са спектакля «На паўмільярдным кіламетры»:

Любы мой, не з табой,
А з праклятай бядой
Заручоная...

І кадры, у якіх дзяўчат вязуць у нямецкі палон. Вузкі прамень святла рэжа па іхніх тварах. Гэта, мусіць, быў адзін з лепшых момантаў у спектаклі. Магутную паэзію Аркадзя Куляшова не зацінулі рамкі тэлебачання, а, наадварот, зрабілі набатнай.

Добра сыграла ролю Цёткі, вядомай беларускай паэтэсы-рэвалюцыянеркі, народная артыстка рэспублікі Марыя Захарэвіч у спектаклі «Стану песняй у народзе».

Ён рос ад спектакля да спектакля, набываючы вопыт і вывучаючы магчымасці тэлебачання, якіх не меў тэатр. Не пашкодзіла, што папрацаваў раней акцёрам і тэатральным рэжысёрам. Віцябчане помняць у пастаноўцы Забелы «Амністыю» М. Матукоўскага на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа. А ў спектаклі «Сцежкі зведаныя і нязведаныя» па раману Аляксея Кулакоўскага яны разам з аператарам Андрэем Бычкоўскім знайшлі цікавыя хады. Сцэна з канём, гаспадар якога, Багдан Хацяноўскі, вядзе ў агульную стайню (час калектывізацыі), атрымалася пераканаўчая і дакладная. Дый астатнія моманты выйшлі псіхалагічна апраўданыя. І вельмі важна тое, што спектакль амаль нічога не згубіў у параўнанні з раманам. Мабыць, хутчэй прыўзняў твор, адкрыў яго чытачу ў новым ракурсе. Яднанне літаратуры і тэлебачання было дзякуючы Уладзіміру Забелу надзвычай удалым. Рэжысёр знайшоў магчымасць мовай і сродкамі тэлеэкрана яскрава прачытаць і данесці да мільёнаў гледачоў беларускую прозу. Выдатна выконваў сваю ролю заслужаны артыст БССР Павел Дубашынскі. Яго Багдан Хацяноўскі вельмі чалавечны і праўдзівы. Як і ў спектаклі «Крыло цішыні» па аповесці Янкі Сіпакова падлетак Ясь у выкананні Сяргея Жураўля. Дарэчы, гэты спектакль атрымаў найбольшую рэакцыю гледачоў. Было многа пісьмаў, дзе выказваліся словы ўдзячнасці рэжысёру Уладзіміру Забелу і мастаку Алене Шкаевай за радасць сустрэчы з цікавым, шчырым і эмацыянальным творам.

Уладзімір Паўлавіч летась вазіў сваё «дзецішча» на Усесаюзны фестываль тэлевізійных спектакляў у сібірскім горадзе Кемерава. Рашэнне ўсіх членаў журы было аднагалосным: першы прыз. Потым аўтарам спектакля ўручылі яшчэ прыз сімпатый тэлегледачоў і прыз за лепшы сцэнарый.

Ужо была ўпэўненасць у сваіх сілах, калі Забела вырашыў экранізаваць апошні раман «Палескай хронікі» Івана Мележа — «Завеі, снежань...» Складаная і адказная стаяла перад рэжысёрам задача — перадаць на тэлевізійным экране моўную своеасаблівасць гэтага твора, яго высокі драматызм і грамадзянскі настрой. Сваімі паплечнікамі, акрамя мастака А. Шкаевай, рэжысёр выбраў артыста А. Падабеда, які выконваў ролю сакратара райкома партыі Башлыкова, і народнага артыста БССР Г. Гарбука, — ён старшыня райвыканкома Апейка.

Адкрыццём для шырокага гледача стала маладая актрыса Галіна Кухальская, якую Забела запрасіў на ролю Ганны. Спектакль на Усесаюзным фестывалі тэлевізійных спектакляў у Кішынёве атрымаў першы прыз. І ў рэшце рэшт адзнака творчай вышыні, нястомнай працы — Дзяржаўная прэмія БССР за спектаклі «Крыло цішыні» і «Завеі, снежань...». У газетах было надрукавана паведамленне якраз тады, калі Забела быў у Рызе. Па просьбе латышскіх калег вазіў ім свой спектакль «Лісце каштанаў» па аповесці У. Караткевіча.

...Недзе далёка гукнулі, і возера данесла да Уладзіміра Паўлавіча штосьці накшталт рэха. Ён падумаў, што ўсе ягоныя ўспаміны аб мінулай працы, мусіць, нечым падобныя на гэты ледзь чутны крык. Ён зараз ведае, што яго хвалявала столькі дзён: зноў прачыналася неатольная смага работы, прыйшоў час для новага пачатку. Аповесць Віктара Казько, якой ён захапіўся летась, раптам разгарнулася перад ім у стройным, гарманічна пабудаваным спектаклі. Яму было ясна, каго з акцёраў запрасіць, каму якую ролю даручыць. На душы стала лёгка і радасна.

Уладзімір Паўлавіч порстка ўскочыў з чаўна, азірнуўся вакол, нібыта развітваючыся з возерам, гэтымі сінімі ад прыцемак кустамі, вёскай, і рушыў дахаты.

Раніцай аўтобус вёз яго ў горад. Уладзімір Забела адчуваў сябе здольным зварухнуць горы: ідэі чакалі ўвасаблення.

Віктар СУПРУНЧУК.

НА ЗДЫМКАХ: рэжысёр У. ЗАБЕЛА; сцэна з тэлевізійнага спектакля «Завеі, снежань...».



ПІСЬМЕННІКІ Ў ГАСЦЯХ У ВУЧОНЫХ

Таварыства аматараў кнігі пры Беларускім навукова-даследчым Інстытуце бульбы і плодаагародніцтва, што ў пасёлку Самахвалавічы Мінскай вобласці, параўнальна маладое — яму крыху болей чым шэсць гадоў.

Члены таварыства падтрымліваюць цесную сувязь з Саюзам пісьменнікаў БССР. Нядаўна яны запрасілі да сябе ў госці пісьменнікаў, якія ўдзельнічалі ў рабоце пленума Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Дэлегацыю сустракалі і віталі супрацоўнікі інстытута. Але ў адрозненне ад традыцыйных «хлеба-солі», яны паднеслі літаратарам кошык з падарункамі восені — пладамі новых сартоў яблынь і груш беларускай селекцыі, а каранавала кошык буйная цёмна-фіялетавая гронка мясцовага вінаграду.

Гасцей вучоныя запрасілі на выстаўку, дзе былі паказаны ўзоры 20 новых сартоў гароднінных культур, 19 сартоў бульбы і 28 сартоў яблыкаў. Многія з іх створаны супрацоўнікамі інстытута. Пра дасягненні ў агародніцтве коратка расказаў дырэктар інстытута А. Круглякоў. Госці толькі паспявалі запісваць назвы і якасці сартоў, што спадабаліся.

Затым усе накіраваліся ў актавую залу, дзе сабраліся супрацоўнікі інстытута, вучні і настаўнікі мясцовай Самахвалавіцкай школы.

Доўга гучалі вершы і ўспыхвалі бурныя апладысменты. Вершы чыталіся не толькі на беларускай, але і на рускай, украінскай, латышскай і літоўскай мовах, таму што ў госці да вучоных разам з беларускімі паэтамі прыехалі старшыня Савета па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР А. Аўчарэнка і адказны сакратар Савета В. Шчадрына, маскоўскі паэт В. Рахманаў, паэт-перакладчык Б. Кежун з Ленінграда, украінская паэтэса і перакладчыца Т. Каламіец, паэт-перакладчык з Рыгі А. Веян і паэт А. Балтаціс з Вільнюса. Усе яны перад гэтым прымалі ўдзел у рабоце пленума Саюза пісьменнікаў БССР.

Ад імя аматараў кнігі інстытута выступіла К. Пазняк — старшыня бюро арганізацыі Таварыства кнігалюбаў. Яна прачытала калектыўнае вершаванае прывітанне-пажаданне літаратарам ад супрацоўнікаў інстытута.

Анатоль БАЯРОВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: беларускія паэты Н. ГІЛЕВІЧ, А. ВЯРЦІНСКІ і маскоўскі паэт В. РАХМАНАЎ гутараць з супрацоўнікам інстытута кандыдатам сельскагаспадарчых навук В. МАЦВЕЕВЫМ.

Фота аўтара.

ЗАПІСАНА ФІРМАЙ «МЕЛОДИЯ»

Сярод самадзейных калектываў рэспублікі, якія плённа прапагандуюць народныя песні, звычаі, абрады, адно з першых месцаў належыць этнаграфічнаму ансамблю вёскі Ананчыцы Салігорскага раёна. Канцэрты з яго ўдзелам добра вядомы не толькі на Салігоршчыне, але і далёка за яе межамі.

Усесаюзная фірма грамзапісу «Мелодия» выпусціла стэрэафанічны дыск-гігант «Этнаграфічны ансамбль вёскі Ананчыцы Салігорскага раёна», на якім запісана васемнаццаць беларускіх народных песень. Сярод іх такія мілагучныя творы, як «Сонца», «Шырокая паляначка — добра жыта жаці», «А ў полі бярозка». Іх спяваюць Вольга Пажыган, Марыя Сарокіна, Матрона Міхнавец, Ева Міхнавец і іншыя выканаўцы.

А. БАДРОЎ.

ЛЮБІМЫ МАТЫЎ МАСТАКА — ЯБЛЫНІ Ў КВЕЦЕНІ

ФАРБЫ ЯК ЗЫЧНЫЯ ГУКІ СВЯТА ЖЫЦЦЯ

Знешне Міхась Рагалевіч вельмі сціплы, ураўнаважаны, спакойны чалавек і болей нагадвае працаўніка вёскі, чым мастака. І ў творах яго адметны тыпаж селяніна, толькі жывуць героі яго карцін не на вёсцы, а большасцю ў гарадскіх кварталах. Гэта тыя ж сяляне, якія калісьці з'ехалі ў горад, са звычкамі, традыцыямі, філасофіяй людзей ад зямлі — нястомных працаўнікоў, аптымістаў і жыццялюбаў. Відаць, таму і фарбы ў творах гэтага жывапісца такія зямныя і столькі ў іх энергіі і моцы.

Калі я ўпершыню ішла на персанальную выстаўку Міхася Рагалевіча — чакала для сябе адкрыццяў, бо кожная, нават асобная яго работа на чарговых рэспубліканскіх выстаўках з'яўлялася святам хараства, хоць і камерным, але запамінальным. Прадчуванні спраўдзіліся: Міхась Рагалевіч на выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю з дня яго нараджэння, прадстаў цікавым і вельмі арыгінальным у кантэксце сучаснага беларускага мастацтва жывапісцам і малявальшчыкам. Гэта адзначылі і шматлікія наведвальнікі выстаўкі.

Адзін чалавек, які даўно і няблага ведае Міхася Рагалевіча, сказаў мне, што любімы матыў творчасці гэтага мастака — яблыня: яблыня ў квецені, яблыня са спелымі яблыкамі, проста яблыкі ў разнастайных нацюрмортах. Мяркуючы па выстаўцы, гэта і сапраўды так. Відарысы яблынь панавалі ў экспазіцыі і ў асобна прысвечаных ім сюжэтах, і ўваходзілі гучным акордам у тэматычныя карціны, дапаўнялі партрэтныя творы, упрыгожвалі краявіды. Але сам мастак у гутарцы зазначыў, што болей за ўсё любіць пісаць вясну, а квітнеючыя яблыні — неад'емная яе прыкмета.

Падыходзім з Міхасём Рагалевічам да карціны «Веснавая краса». Гэта невялікае палатно, якое здалёк прываблівае пяшчотнай гамай спалучэння блакітнага, светла-зялёнага, белага і неназойліва ўплеценага карычневага колераў. Рагалевіч тлумачыць: «Калі пісаў гэту карціну, да мяне падышоў нейкі дзядзечка і спытаў, чаму з усяго саду я абраў самае карчастае, старое дрэва. А я ж задаўся мэтай паказаць, як надыход вясны адраджае прыгажосць, асвятляе старое жыццё ўзлётамі цвіцення. Да таго ж, як мастака, мяне зацікавілі вузлаватыя перапляценні цёмных галін дрэва. Драматызм іх ліній вытанчана падкрэслены празрыстым арэолам белых кветак — у гэтым алегарычна прачытаным сюжэце можна вызначыць філасофію жыцця».

І ўсё ж сюжэты яблыні і яблыкаў не вызначаюць асноўны кірунак пошукаў мастака, але вельмі часта адыгрываюць вялікую ролю ў тэматычных карцінах М. Рагалевіча. Сярод іх адна з найбольш любімых аўтарам — «Восень». ...Цяжарная жанчына і мужчына з дзіцем на каленях сядзяць за сталом ля акна ў сялянскай хаце. На стале як сімвал жыццёвай моцы прыроды, як заклік, як зычныя гукі свята жыцця — чырванеюць яблыкі, а за акном паспелае лета ў вобразе яблыні-прыгажуні, бы то святочным дываном ахутанай шчыльным покрывам яблык... Сістэма сімвалаў у гэтай карціне трапна ўплывае на асацыятыўны ход мыслення гледача і стварае моцнае ўражанне. Зусім іншы вобразна-жывапісны ход выбірае мастак на шляху стварэння партрэта-карціны «Ул. Белы — фізік-крышталаоптык». Дэкаратыўнасць фарбавых спалучэнняў тут замяняецца лірычнай гармоніяй пастэльных таноў, пластыка малюнка становіцца вельмі павольнай — як шчымлівая, але светлая песня пра нязведанае шчасце, яго прадчуванне. Герой карціны — рамантычны юнак. Ён абапіраецца, раскінуўшы рукі, на галіны і ствол квітнеючай яблыні. Паміж галінамі дрэва праглядае мяккая блакітнасць веснавога неба.

— Вобраз чалавека, якога я тут паказаў, вельмі светлы, чысты. Мой герой — сціплы, спакойны, адкрыты і вельмі таленавіты чалавек. Я такіх асабліва паважаю. Родам ён з вёскі,— расказвае мастак.

— А якіх людзей вы найбольш любіце маляваць? — спытала я ў Міхася Рагалевіча.

— Якраз такіх, як Уладзімір Белы. А яшчэ цікавяць мяне людзі, якім выпаў нялёгкі жыццёвы лёс.

Няцяжка зразумець мастака, бо ў пяць месяцаў ён застаўся без бацькі, а ў тры гады — без маці, гадаваўся ў дзіцячым доме. Прага маляваць прывяла яго ў 1959 годзе ў мастацкае вучылішча. Вучыўся ён старанна. З часоў заканчэння вучылішча прайшло амаль дваццаць год. Выраслі ўласныя дзеці — сын і дачка. Шмат за гэты час створана карцін.

Вельмі часта М. Рагалевіч піша і малюе блізкіх яму, родных людзей, паказвае сцэнкі ўласнага сямейнага быту і нясе іх гледачу як патаемны, бясцэнны скарб. Паказаныя на выстаўках лепшыя з гэтых карцін станоўча адзначаліся ў рэспубліканскім друку, выдатна прымаліся гледачом. Многім спадабаліся і запомніліся карціны «Школьніца», «Вясна», «Вечар», «Праводзіны», «У свабодную хвіліну», «Святочны вечар», «Журавіны» і іншыя.

Пачуццём любові мастака да роднай Беларусі вызначаюцца яго шматлікія пейзажы. Болей за ўсё жывапісец піша ўскраіны горада, палі, лясы і рачулкі, што непадалёку ад Мінска. Выязджаў на эцюды на Віцебшчыну, пісаў прасторы роднай Уздзеншчыны.

— А далёка ад дома не цягне,— прызнаецца мастак,— хоць бы тут болей пабачыць.

І яго пазіцыя гучыць пераканаўча, калі разглядаеш пейзажы «Вясёлка», «Квітненне», «Блакітны дзень», «Ясень», «Клёны», «Краявід з чырвонай хатай», «Уздзеншчына», «Сакавік», «Яблынька», і іншыя.

Многа цікавых нацюрмортаў напісаў Міхась Рагалевіч. А яшчэ болей экспанавалася на яго юбілейнай выстаўцы партрэтаў. Прыемна здзівіў мастак наведвальнікаў выстаўкі сваімі малюнкамі. Яны атрымліваюцца ў М. Рагалевіча вельмі характарнымі, вобразнымі. Нават не верыцца, што мастак стварае іх з аднаго сеанса, без падрыхтоўчых эскізаў.

Таццяна ГАРАНСКАЯ,
мастацтвазнаўца.

НА ЗДЫМКАХ: М. РАГАЛЕВІЧ. «Беларуска», «Антось і Ганна».

КАБ ГЛЕДАЧЫ ЗАДУМАЛІСЯ НАД ТЫМ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў СВЕЦЕ

ПАПЯРЭДЗІЦЬ АБ НЕБЯСПЕЦЫ

На экраны кінатэатраў нашай краіны выходзіць новы публіцыстычны дакументальны поўнаметражны фільм «Папярэджанне аб небяспецы». Яго аўтары — вядомы кінарэжысёр-дакументаліст лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР Джэма Фірсава і журналіст-міжнароднік Генрых Гуркоў.

Карэспандэнт Агенцтва друку Навіны Васіль МАРОЗАЎ сустрэўся з адным з аўтараў фільма — Джэмай ФІРСАВАЙ і папрасіў яе адказаць на некалькі пытанняў.

— Як бы вы вызначылі задачу фільма і яго лейтматыў?

— Калі паспрабаваць сфармуляваць у адной фразе сутнасць і змест фільма, над якім мы працавалі амаль тры гады, то гэта стужка пра трэцюю сусветную вайну, дапусціць якую нельга, бо яна азначала б у ядзерную эпоху гібель усяго чалавецтва. Які напрошваецца вывад? Толькі адзін: «Мы павінны навучыцца думаць па-новаму...» Дакумент, у якім прагучалі гэтыя словы, быў апублікаваны ў Лондане 9 ліпеня 1955 года і атрымаў назву «Маніфест Расела—Эйнштэйна». Ён быў падпісаны людзьмі, якія яшчэ на пачатку ядзернага стагоддзя з поўнай яснасцю бачылі, чым стала б для чалавецтва ядзерная вайна.

Напомню, што ў ліку тых, хто падпісаў «Маніфест», акрамя Альберта Эйнштэйна і Бяртрана Расела былі яшчэ і Макс Борн, Леапольд Інфельд, Лайнус Полінг, Джазеф Ротблат, Фрэдэрык Жоліо-Кюры... Яны ведалі, яны папярэджвалі. Але ці стала іх веданне і разуменне пагражаючай чалавецтву небяспекі веданнем і разуменнем народаў і ўрадаў? Не было выпадковым, што праз чвэрць стагоддзя пасля «Маніфеста Расела—Эйнштэйна» з трыбуны XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза прагучаў заклік аб стварэнні аўтарытэтнага міжнароднага камітэта вучоных, які растлумачыў бы ўсім, што такое ядзерная вайна і да якіх вынікаў яна прывяла б. Проціпаставіць веданне небяспецы няведання...

Мы спрабавалі ў сваім фільме даказаць тое, што, на жаль, яшчэ даводзіцца даказваць у сённяшнім свеце: **мы павінны навучыцца мысліць па-новаму!** Хіба перавяліся на Захадзе ваенныя, палітыкі, ды і вучоныя (хоць і цяжка часам іх так называць!), хто верыць ці, па крайняй меры, сцвярджае, што ядзерную вайну можна абмежаваць, можна пачаць і выйграць, калі да яе належным чынам падрыхтавацца і дакладна і своечасова нанесці першы папераджальны ядзерны ўдар.

— Якія матэрыялы выкарыстоўваліся ў рабоце над фільмам?

— Калі мы пачыналі работу над сцэнарыем, на нас абрушылася страшная лавіна матэрыялу — фактычнага, навуковага, гістарычнага. Мы праглядзелі тысячы метраў плёнкі, адзнятай ва ўсім свеце з часу ўзнікнення кінематографа: свет да першай сусветнай, свет у першай сусветнай вайне, свет між войнамі, другая сусветная, «падрыхтоўка да трэцяй»...

Страшны матэрыял сусветных войнаў і перадышак між імі. Гэты матэрыял, адзняты ў розныя гады і дзесяцігоддзі аператарамі розных краін, людзьмі з неаднолькавымі, часта процілеглымі палітычнымі пазіцыямі, складваўся перад нашымі вачыма ў карціну часу. Мы азнаёміліся з бясконцай колькасцю дакументаў, з адзнакамі і меркаваннямі палітыкаў, публіцыстаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў, якія разважалі над сітуацыяй, у якой апынулася сучаснае чалавецтва. Мы ўсведамлялі, што падзейна-дакументальная аснова карціны павінна быць як мага больш старанна распрацаванай, варыянтнай па складу ўваходзячых у яе фактаў і дакументаў, каб не «адлюстраваць» маментальную — няхай і надзвычай важную сітуацыю, а прадбачыць, прадугадаць тэндэнцыі развіцця ўсіх сукупных сітуацый, магчымых у межах данага аспекту даследавання.

Праца вялася ў асноўным у гіганцкіх і далёка яшчэ не вычэрпаных кінаархівах Дзяржфільмафонду СССР і Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў СССР, а таксама ў кінаархівах Швецыі і ГДР. Шырока была выкарыстана хроніка, якую мы атрымліваем ад англійскай фірмы «Візньюс».

Акіян фільматэкі сапраўды бязмежны, і многія кадры, якія з'явіліся ў нашым фільме ў выніку многамесячных пошукаў, глядач убачыць на экране ўпершыню. Фільм мантажны. Асноўны яго мятраж — фільматэчны матэрыял. Аднак хацелася б адзначыць прыцэльна, з настроем і тактам знятыя рэпартажныя эпізоды — работу вядомага савецкага кінааператара Уладзіслава Мікашы.

Адзін з асноўных кампанентаў фільма — музыка. Многія эпізоды былі задуманы зыходзячы з музыкі, манціраваліся пад музыку, выстройваліся па законах музыкальнай гармоніі. Фільм наш можна з поўным правам назваць музычным. Мы ўзялі ў сааўтары Моцарта і Бетховена, Баха і Вагнера. І дастойным прадстаўніком музычнага цэха паказаў сябе ў нашым фільме кампазітар і арганіст Алег Янчанка, які не толькі напісаў для фільма выдатную музыку, але і выканаў на органе ва ўласнай інтэрпрэтацыі выдатную музыку Баха, Вагнера, Бетховена. У прыватнасці, у нашай карціне ўпершыню прагучала «Лунная саната» ў арганным выкананні...

Сорак гадоў назад загінуў чалавек, імя якому Юліус Фучык. Ён сказаў бессмяротныя словы: «Людзі, я любіў вас, будзьце пільнымі!» На цяперашнім этапе сусветнай гісторыі словы гэтыя поўныя сапраўды апакаліпсічнага сэнсу. Калі фільм «Папярэджанне аб небяспецы» прымусіць гледача задумацца над тым, што адбываецца ў нашым складаным і супярэчлівым свеце, прымусіць задаць сабе і іншым пытанне, што можна зрабіць для спынення вар'яцтва гонкі ўзбраенняў, як можна выбрацца з ядзернага тупіка, у якім апынулася чалавецтва, калі ён стане пясчынкай на чашы вагаў, што схіляюць свет да міру, — мы, стваральнікі фільма, будзем адчуваць сябе шчаслівымі.

ГЕРОІ—ПРАЦАЎНІКІ ВЁСКІ

Прэм'ера мастацкай стужкі «Канец бабінага лета» сабрала ў Доме культуры працаўнікоў калгаса «Шлях камунізму» Мінскага раёна. Механізатары і паляводы па ўжо існуючай традыцыі сталі першымі гледачамі і крытыкамі новай карціны іх шэфаў — кінематаграфістаў «Беларусьфільма». Такая цікавасць сельскіх гледачоў да карціны зразумелая: аўтар сцэнарыя А. Асіпенка і рэжысёр-пастаноўшчык Д. Ніжнікоўская расказваюць пра сённяшні дзень вёскі, пра яе людзей, іх клопаты.

— Новая стужка працягвае цыкл фільмаў аб сацыяльных пераўтварэннях у вёсцы,— сказаў старшыня Дзяржкіно БССР У. Мацвееў. — Гледачы пазнаёміліся ўжо з карцінай В. Турава «Людзі на балоце» па раману лаўрэата Ленінскай прэміі І. Мележа, якая расказвае аб класавай барацьбе на Палессі ў гады калектывізацыі, і фільмам І. Дабралюбава «Трэцяга не дадзена» пра легендарнага партызанскага камандзіра, Героя Савецкага Саюза В. Каржа, які ўзначаліў пасля вайны калгас, кінастужкай В. Чацверыкова «Паводка». Гэтым работам спадарожнічалі прызнанне і поспех.



Гэты дом у вёсцы Міхалева-3 Бабруйскага раёна нібы казачны палац. Сцены яго і франтон упрыгожваюць драўляныя фігуркі герояў народных казак, дзверы і вокны аздоблены арнаментамі мудрагелістых шалёвак, цягнецца ў неба прыгожы канёк даху...

Гаспадар незвычайнага дома — Аркадзь Шырокі. Разьбой па дрэве захапляўся з дзяцінства. Пазней вучыўся на сталяра, працаваў мастаком-афарміцелем. Пасля службы ў войску вярнуўся ў родны калгас і працуе будаўніком. Але любімага занятку не кідае. Цяпер майстар афармляе калгасную лазню.

Фота У. АЛЯШКЕВІЧА.

ПЕРУНОЎ МОСТ

У сельсавеце пацвердзілі: ёсць такая вёска — Перуноў Мост. Знаходзіцца на тэрыторыі саўгаса «Горкі» — саўгасная брыгада. Але ў Лядах ніхто не ведаў, чаму ў вёскі такое дзіўнае імя. Параілі сустрэцца з карэннымі жыхарамі — Верай Русецкай і былым лесніком Францам Івашкевічам.

З цэнтральнай сядзібы еду на спадарожнай машыне ў Перуноў Мост. Па дарозе выглядаю рэчку, цераз якую перакінуты мост. Бульбянае поле — «мінералку» змяняе шырокі пояс асушаных, засеяных травамі тарфянікаў. Далей наперадзе — паласа лесу і на яе фоне дзесятка паўтара хацінак — гэта і ёсць Перуноў Мост. А рэчкі там і не відаць. Дарога ўзнялася на насып. І вось тут мы па тыповым для нашага часу жалезабетонным з застаўкай мосце-шлюзу пераехалі нарэшце нешырокую меліяратыўную канаву. Затым дарога ўвайшла пад старыя вербы, на грэблю і вывела да вёскі.

Франца Ануфрыевіча застаў дома. Пазнаёміліся, і я адразу запытаўся:

— Вёска ваша Мостам называецца, а дзе ж рэчка?

Адказ нечаканы:

— А яе тут і не было.

— Цераз што ж тады наводзілі мост?

Франц Ануфрыевіч цярпліва працягвае:

— У той час нельга было ў нас без моста абысціся. Вунь там, дзе цяпер у канаву ваду сабралі, была гіблая дрыгва, ні ўвесну, ні ўвосень, як кажуць, ні прайсці ні праехаць. А выхад на стары, як тады яго называлі, Кацярынінскі тракт з гэтага боку самы кароткі, інакш рабі крук вёрст на дзесяць. Вось і выслалі бярвёнамі, засыпалі пяском грэблю, частка якой і цяпер яшчэ прыкметная. А над самым багністым месцам пабудавалі сапраўдны, на палях, мост. Гаварылі, нават не адзін, а тры масты засаб. Калісьці тут праходзіла бойкая дарога з Мінска, Пухавіч і да пераправы цераз Бярэзіну. Старыя казалі, што ў войны па ёй не адзін раз рухалася войска, праходзілі абозы.

— Адкуль жа ў моста, хай сабе і пабудаванага цераз балота, такое нечаканае прозвішча — Перуноў?

— Ды быццам бы першы мост цераз дрыгву пабудаваў тут ці то немец, ці то француз, па прозвішчу Пюры. З цягам часу ягонае прозвішча, якое так добра дадалося да моста, і перайначылі тутэйшыя жыхары на свой лад—Пярун. А ўжо ад моста і вёску (з яе, дарэчы, заўсёды прызначаўся даглядчык моста і грэблі) назвалі Перуноў Мост...

Іншае, амаль казачнае тлумачэнне назвы я пачуў ад Веры Ігнатаўны.

Сапраўды, гіблай была дрыгва, яна аддзяляла некалькі вёсак ад мястэчка і тракту. Абрыдла кожны раз кладкі насцілаць, і парашылі людзі збудаваць цераз балаціну мост. Узяліся ўсёй талакой і зрабілі справу — навялі мост. Толькі прастаяў ён нядоўга, усяго з месяц, бо аднойчы, ноччу, у навальніцу, раптам загарэўся ад удару маланкі. Праз год на тым месцы збудавалі другі мост. Ды толькі з ім здарылася тое ж самае—падпаліў пярун. Але ж вельмі была патрэбна тут дарога, і на наступнае лета цераз дрыгву навялі трэці мост. На ім пярун і скончыў выпрабоўваць цярпенне людское — больш не падпальваў. Вось той мост і празвалі Перуновым, а ад яго і вёска атрымала сваё імя...

М. ПРАКОПЧЫК.

Гумар

Шатландца выцягнулі з мора. Як толькі ён аддыхаўся, яго жонка прапанавала:

— Давай дадзім гэтаму хлопцу, што выратаваў цябе, фунт стэрлінгаў.

— Увогуле, дарагая, гэта разумная ідэя, але ўлічы, калі ён выцягнуў мяне на бераг, я быў ужо напоўжывы, так што хопіць з яго і палавіны.

●

Поўная дама скардзіцца сяброўцы:

— Я атрымала кватэру ў новым доме. Кухня такая маленькая, што я ў ёй ледзь паварочваюся.

— А ты здзяры шпалеры,— раіць сяброўка.

Праз некаторы час яны сустракаюцца зноў.

— Я ліквідавала шпалеры!

— І стала лепш?

— Крыху прасторней, аднак цяпер, калі я рэжу цыбулю, плачуць усе суседзі!

НА ВЫСТАЎЦЫ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

На Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая прайшла ў верасні на ВДНГ СССР, вялікім поспехам карыстаўся павільён Беларускай ССР. З густам афармлены, ён змясціў не толькі больш за 500 найбольш цікавых кніг, якія выйшлі за апошнія гады ў выдавецтвах рэспублікі, але і невялікую выстаўку беларускіх мастакоў-графікаў — рэпрадукцыі з твораў кніжнай графікі, экслібрысы.

На выстаўцы кніжнай графікі ўвагу наведвальнікаў прыцягвалі рэпрадукцыі работ такіх вядомых мастакоў кнігі, як А. Кашкурэвіч, У. і М. Басалыгі, Г. і Н. Паплаўскія, М. Селяшчук, У. Савіч, Ю. Зайцаў, А. Лось, П. Драчоў, А. Лапіцкая і інш. У экспазіцыю ўвайшлі ілюстрацыі да твораў Я. Купалы, П. Броўкі, І. Шамякіна, Н. Крупскай, Д. Свіфта, У. Караткевіча, да беларускіх народных казак і інш.

Уключаныя ў экспазіцыю экслібрысы былі аб'яднаны галоўнай тэмай — тэмай Беларусі. Экслібрысы беларускіх пісьменнікаў І. Мележа, Р. Барадуліна, С. Панізніка, А. Русака, А. Вялюгіна, А. Гардзіцкага паказалі А. Кандрусевіч, Р. Фралоў, Г. Грак, К. Ціхановіч, Г. Галубовіч. Да 100-гадовага юбілею Янкі Купалы мастак В. Лявоненка стварыў аўтаэкслібрыс, дзе ўвасоблены вобраз вялікага песняра. Наведвальнікі выстаўкі ўбачылі экслібрысы кампазітара І. Лучанка (мастак М. Ганчароў), касманаўта У. Кавалёнка (мастак У. Садзін).

Цікавасць гледачоў выклікаў экслібрыс У. Басалыгі для Літаратурнага музея Якуба Коласа, сувенірны экслібрыс А. Кашкурэвіча для выдавецтва «Мастацкая літаратура», на якім мастак стварыў вобраз беларускага паэта эпохі Адраджэння М. Гусоўскага.

У экспазіцыю ўвайшлі таксама экслібрысы М. Селешчука, Ю. Баранава, Я. Красоўскага, Я. і Г. Ціхановічаў, Я. Куліка, В. Шматава.

М. МІНКЕВІЧ.

Экслібрысы мастакоў В. ЛЯВОНЕНКІ і Г. ГРАКА.

ЦЫРК—ГЭТА РАДАСЦЬ

Зноў ярка запаліліся агні Мінскага дзяржаўнага цырка. Мінчан і гасцей сталіцы чакаюць прыемныя сустрэчы з майстрамі арэны.

Маляўнічым парадам усіх удзельнікаў прадстаўлення пачынаецца свята на манежы. Гасцінна сустракае публіка першых выканаўцаў — ралікабежцаў пад кіраўніцтвам Святланы Дубавіцкай. Змяняючы адна адну, гучаць папулярныя мелодыі «Калінкі», «Цыганачкі». Весела, у імклівым рытме танцуюць у ярказялёных касцюмах дзяўчаты і хлопцы.

Сваё майстэрства дэманструюць гімнасты-эквілібрысты на першах пад кіраўніцтвам Юрыя Палоўнева, паветраныя гімнасткі Наталля Аўрамовіч і Людміла Пашук, акрабаты Альфія і Эльдар Рахматуліны. Уражвае складаны атракцыён паветраных эквілібрыстаў у выкананні сясцёр Аўдзеевых.

Дастойным упрыгажэннем праграмы з'яўляецца групавы нумар — коннаакрабатычная пантаміма «Горская легенда» пад кіраўніцтвам заслужанага артыста РСФСР Тамерлана Нугзарава. На манежы нібыта ажываюць старонкі далёкага мінулага. Артысты дэманструюць каскад складаных трукаў, смеласць і спрыт.

А які цырк без клоуна! Заслужаны артыст РСФСР, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Юрый Куклачоў добра знаёмы гледачам многіх гарадоў краіны. Лёгка і проста вядзе ён сваю ролю. Выдумшчык і забаўнік, ён знаходзіць кантакт з публікай, не дае сумаваць нікому. Папулярны клоун разам са сваімі чатырохногімі «артыстамі» — кошкамі выклікае вясёлую ўсмешку і ў дарослых, і ў дзятвы.

Сярод першых гледачоў новай праграмы нямала жыхароў вёскі. А наперадзе — новыя сустрэчы. Майстры манежа заўсёды рады бачыць у сябе ў гасцях тых, хто сёння нясе сваю вахту ў полі, на фермах. Сельскія жыхары не толькі пабываюць на прадстаўленнях у цырку, але і будуць прымаць артыстаў на сцэнах сваіх клубаў.

А. ПЕДЗІК.

НА ЗДЫМКАХ: выступаюць ралікабежцы пад кіраўніцтвам С. ДУБАВІЦКАЙ; сілавыя акрабаты В. СДАБНІН і Ю. ІЛЬЮШЫН.

Фота В. ШУБЫ.

БУКЕТ БЕЛАВЕЖЫ

Выстаўка лекавых траў і раслін адкрыта ў Каменюках — цэнтральнай сядзібе паляўніча-запаведнай гаспадаркі «Белавежская пушча».

Цудоўны «букет» дзесяткаў рэдкіх раслін сабраны навуковымі супрацоўнікамі пушчы і студэнтамі-практыкантамі з розных вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

У пушчанскім лесе расце 836 відаў раслін, а 35 з іх — рэдкія, у адзінкавых экземплярах. У экспазіцыі можна ўбачыць купальнік горны, астранцыю буйную, гладыш шыракалісты, бружмель лясны, мядзведжую цыбулю, талакнянку звычайную, іншыя расліны, якія адносяцца да лекавых. Некаторыя з іх, папярэджваюць вучоныя, знаходзяцца пад пагрозай знікнення. І аб гэтым павінен ведаць кожны, хто любіць прыроду.

Шматгадовая даследчыцкая работа навуковых супрацоўнікаў паляўніча-запаведнай гаспадаркі і кафедры батанікі Брэсцкага педінстытута абагулена ў гербарыі «Флора Брэсцчыны», таксама прадстаўленым на выстаўцы.

П. СУСІКАЎ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1849